Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Ленінскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа»

# web-квэст
# «Сцежкамі роднага краю»




Распрацоўшчык: намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці, настаўнік гісторыі, грамадазнаўства і мастацтва (АСМК) А.М.Слуцкі

Леніна, 2019

**Накірунак:**
**грамадзянска-патрыятычнае выхаванне**

У артыкуле разгледжаны этапы падрыхтоўкі і правядзення краязнаўчага квэста, які арганічна ўпісваецца ў тэматыку Года молой радзімы. Артыкул арыентараваны на намеснікаў дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, настаўнікаў, класных кіраўнікоў, выхавальнікаў. Матэрыял такасама будзе цікавы для аматараў гісторыі і педагогаў дадатковай адукацыі.



*Слуцкі Аляксандр Міхайлавіч,*
*намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці, настаўнік гісторыі, грамадазнаўства і мастацтва (АСМК) дзяржаўнай установы адукацыі «Ленінскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа», Слуцкага раёна Мінскай вобласці*

## Квэст «Сцежкамі роднага краю»

**Мэта:** пашырыць веды пра гісторыка-культурную спадчыну роднай вёскі; садзейнічаць фарміраванню паважлівых адносін да сваей малой Радзімы, выхоўваць пачуцце гонару і глыбокай павагі да нацыянальных традыцый, звычаяў і культуры.

На падрыхтоўчым этапе мерапрыемства пракладзены прыкладны маршрут у які ўвайшлі такія пункты, як: археалагічнае паселішча, помнік аднавяскоўцам загінуўшым у годы Вялікай Айчыннай вайны, помнік у гонар боя пры Раманаве 1812 г., ДУА “Ленінскі ВПК яслі-сад – СШ”. Разам з краязнаўцам – настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Л. І. Дзедзінай, быў пройдзены ўвесь маршрут і складзены пуцявы ліст. Працягласць маршруту – 2 км.

Для падрыхтоўкі да мерапрыемства вучням быў прапанаваны электронны рэсурс – сайт праекта «Зямля бацькоў – мая зямля» www.romanovo.ucoz.net, на якім размешчана інфармацыя аб гісторыі роднай вёскі.

У дзень правядзення квэста за паўгадзіны да пачатку была зроблена раскладка заданняў на лістах дзвух колераў (для дзвух

каманд). Маршрут быў спланаваны такім чынам, каб на кантрольных пунктах каманды не перасякаліся і такім чынам не дастаўлялі нязручнасцяў адна адной (малюнак 1).




Малюнак 1. Нітка маршрута

Колькасць удзельнікаў квэста не абмежавана. Квэст разлічаны на 30-35 хвілін на маршрут прыведзены вышэй.

Да ліку неабходных матэрыялаў можна аднесці разкладачны матэрыял з зашыфраванымі пунктамі, на якія патрэбна ісці камандзе, тэлефон з фотакамерай, гадзіннікам і падтрымкай інтэрнет-злучэння. На кожным пункце каманда павінна сфатаграфавацца і адаслаць фотаздымак на «viber» альбо ў «Вконтакте».

**Ход мерапрыемства**

*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары-лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць.*

*Я. Колас*

Вядома, што кожны чалавек непасрэдна звязаны з той зямлей, на якой нарадзіўся. І канешне, кожны з нас павінен ведаць мінулае роднага краю, ганарыцца культурнай спадчынай сваей краіны.

Я запрашаю вас прыняць удзел у краязнаўчым квесце «Сцежкамі роднага краю», я спадзяюся, што сення кожны з вас атрымае новыя веды, і зможа далучыцца да духоўных скарбаў малой радзімы.

Леніна – маленькая вёсачка, якая мае сваю вялікую гісторыю. Першае пісьмовые ўпамінанне датуецца 1499 г. У грамаце вялікага князя літоўскага Аляксандра мястэчка згадваецца ў ліку найбольш буйных населеных пунктаў Слуцкага княства, пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай – мястэчка Слуцкага павета. Да 1921 г. вёска насіла назву Раманава. Спачатку Раманава належала слуцкім князям, а пазней перайшло да князёў Радзівілаў. У 1718 г. Раманава ад князя і караля Аўгуста Моцнага атрымлівае прывілей на правядзенне штогадовых кірмашоў. У ліпені 1812 г. каля мястэчка адбыўся бой, у якім рускія войскі затрымалі наступленне французаў і адкінулі іх злучэнні у бок Капыля. У 1866-1867 гг. на сродкі сялян быў пабудаваны будынак для народнага вучылішча. З 1876 г. вучылішча стала дзвухкласным. Прымалі ў яго па два хлопчыка з кожнага населенага пункта. У 1898 г. пачало працаваць другое двухкласнае вучылішча, у якое прымалі і дзяўчынак. У 1972 г. у карыстанне быў ўведзены будынак Ленінскай школы. З 2010 г. вёска Леніна – аграгарадок. Леніна – малая радзіма беларускага кампазітара, аўтара музыкі да песні «Купалінка», Уладзіміра Тэраўскага і сусветна вядомай мастачкі, дываны якой экспануюцца не толькі ў Беларусі, а і за яе межамі, Алены Кіш.

Правілы квэста наступныя. Кожная каманда атрымоўвае ліст з першым заданнем. Пасля расшыфроўкі каманда ідзе у пазначаны пункт, дзе павінна сфатаграфавацца на фоне знака альбо помніка і адправіць фотаздымак праз «viber» альбо ў «Вконтакте» (спасылкі і тэлефон пазначаны на маршрутных лістах).У закладных матэрыялах надрукаваны QR-код, пераход

па якім раскажа аб цудоўнай гісторыі гэтага месца. Фотаздымкі аператыўна друкуюцца і размяшчаюцца ў фае школы на аформленым стэндзе «Сцежкамі роднага краю». Ждаю вам поспехаў!

Вучні праходзяць па маршруце згодна пуцявым лістам прыведзеным ніжэй і дасылаюць свае фота. Пасля праходу ўсіх пунктаў вяртаюцца ў школу.

Пуцявыя лісты:

*Пункт №1*
*Паміж пустак, балот беларускай зямлі,*
*На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай*
*Дрэмле памятка дзен, што ў нябыт уцяклі, –*
*Ўдзірванелы курган векавечны.*
*...*
*На гары на крутой, на абвітай ракой,*
*Год назад таму сотня ці болей,*
*Белы хорам стаяў, недаступнай сцяной*

Пункт: гарадзішча на паўночнай ускраіне вёскі, у народзе мае назву «Замак» (фотаздымак 2.).



Фотаздымак 2.
Фота на фоне памятнага знака на гарадзішчы

*Пункт №2*

*– Скажи-ка, дядя, ведь не даром*
*Москва, спаленная пожаром,*
*Французу отдана?*
*Ведь были ж схватки боевые,*
*Да, говорят, еще какие!*
*Недаром помнит вся Россия*
*Про день Бородина!*

Пункт: помнік у гонар боя пры Раманаве 1812 г. (фотаздымак 3).



Фотаздымак 3. Фота на фоне помніка у гонар боя пры Раманаве 1812 г.

*Пункт №3*

*Калі на Вечны гледзячы агонь*
*Перада мною часам праступае,*
*Нібыта кроў праз белыя бінты:*
*Людзей жывымі, быццам дровы, паляць*
*Фашысты. Раўнадушна, што ж тады*
*Шчаслівых маці іх я уяўляю,*
*Калі пад сэрцам носячы яшчэ*
*Яны пяшчотна ў марах іх люлялі!*

Пункт: помнік аднавяскоўцам, загінуўшым у годы Вялікай Айчыннай вайны (фотаздымак 4).




Фотаздымак 4. Фота на фоне помніка аднавяскоўцам, загінуўшым у Вав

*Пункт №4*

*На скрыжаванні нялёгкіх жыццевых дарог*
*Ёсць два будынкі, якія душу саграваюць,*
*Родная школа і бацькавай хаты парог,*
*Яны нас праводзяць, яны нас заўсёды чакаюць.*

Пункт: Ленінскі ВПК (фотаздымак 5).



Фотаздымак 5. Фота на фоне Ленінскага ВПК

Вось і скончылася наша падарожжа. Я вельмі задаволены вамі. Я рады, што падрастаюць такія добрыя, разумныя дзеткі, якія ўжо так многа ведаюць. Сення мы з вамі яшчэ раз дакрануліся да вялікай гісторыі нашай малой радзімы. Спадзяюся, што наша мерапрыемства вам спадабалася і не заставіла вас раўнадушным. Да новых сустрэч, сябры!

Квэст – гэта не проста мерапрыемства, якое цікавіць вучняў, але і аказвае пэўны выхаваўчы ўплыў: дзеці змаглі ў чарговы раз дакрануцца да мінулага, бліжэй пазнаёміцца з жыццем і побытам нашых продкаў, гісторыяй сваёй малой радзімы.

Спадзяюся, што такі накірунак дзейнасці будзе мець свой працяг. Ужо запланаваны велаквэст, які ахопіць больш дакладна пытанні зараджэння вескі, асноўных этапаў яе развіцця, уключаючы наведванне брацкіх магіл савецкіх воінай, дакладнае месца боя пры Раманаве, месцазнаходжанне гета, памяшканняў былой школы і дзвух цэркваў.



Год малой Радзімы

*Матэрыял разпрацаваны ў рамках Года малой радзімы і падрыхтоўкі зборніка метадычных матэрыялаў лепшых практык правядзення мерапрыемстваў у шосты школьны дзень*


**Наш адрас:**

*223623 аг. Леніна, вул. Камсамольская, 19,*
*Слуцкі раён, Мінская вобласць*

тэл.: 8-017-95-93-1-67
факс: 8-017-95-93-1-38
lenino.znaj.by
LeninskiyUPK@tut.by